РЫГОР БАРАДУЛІН

# ЗОРКА СПАГАДЫ

**рамансы**

KAMUNIKAT.org

Мінск
Ковчег
2000

УДК 882.6-1
ББК 84 (4 Бем) 6-5
Б 24

Выданьне прымеркавана да юбілею паэта. Усе рамансы, змешчаныя ў кнізе, можна пачуць у выкананьні Алеся Камоцкага і Уладзіміра Ткачэнкі на касэце, выдадзенай фірмай Grand Records (т.017-236-22-71).

Барадулін Р.
Б 24 Зорка спагады:Рамансы.Мн.: Ковчег, 2000.- с.36
ISBN 985-6056-32-2

ISBN 985-6056-32-2 **© Барадулін Р., 2000**
**© "Ковчег", 2000**



## АКТРЫСА

Над сонмам гледачоў Вы сьветла панавалі,
Самотнаю душой, суперніца жыцьця.
І захлыналі ўсіх пяшчоты Вашай хвалі,
І несьлі ў акіян сьвятога забыцьця.

Ад рэўнасьці да Вас сябе губляла мэта,
І рэкі ўсе назад да Вашых ног цяклі,
І перайначыць лёс валадара й паэта
Вы позіркам адным з усьмешкаю маглі.

Згаралі залі ўсе ад воплескаў гарачых,
Паклоньнікі ніжэй схіляліся ў журбе.
Іґралі каралеў, манашак і жабрачак,
Ды так і не змаглі сыграць адну сябе.

## АРЫСТАКРАТКА

Лёс мяне сьцежкамі радасьці вёў,
Вёў да цябе на спатканьне,
Ты — беларуска, ты — нашых краёў,
Арыстакратка каханьня.

Гэтак кахаць ад цямна да відна,
Гэтак галубіць да раньня
Можа ў зьняверaным сьвеце адна
Арыстакратка каханьня.

Ты — як пасланьніца сьветлага дня,
Поўная замілаваньня,
Ты недасяжная, як вышыня,
Арыстакратка каханьня.

Панскага роду, натурай ня мніх
Я не хачу панаваньня,
Быць мне дазволь на паслугах тваіх,
Арыстакратка каханьня.

Згодзен кіпець я ў пякельнай смале
І не прасіць ратаваньня,
Толькі б аднойчы сказала "але"
Арыстакратка каханьня.



## ВЯСНОВЫ ДЗЕНЬ

Вясновы дзень быў радасьцю даўгі,
Ды скарацеў, зрабіўшыся зімовым.
Цяпер даўжэе ноч маёй тугі,
Яна не падуладная замовам.

Я разумею ноч, а мне яна
Не паспрыяе, не паспагадае.
Тады было сьвятло, была вясна,
Цяпер азябла цемра галадае.

А ўсё таму, што Вас няма са мной.
А Вы былі калісьці ці ніколі?
Былі маёй зялёнаю вясной,
Вясёлаю бярэзінаю ў полі.

Як той бяздушны вецер, я п'янеў,
І быў зялёны я ў сваім наіве.
Быў добры першы гром і першы гнеў,
І першы сьлед на некранутай ніве.

Штоноч даўжэе ноч маёй тугі,
Радзей вясновае сьвітаньне сьніцца.
Зьвіняць майго адчаю ланцугі.
Самота — беспрасьветная цямніца.

KAMUNIKAT.org

## ГАСПАДЫНЯ

Я прашуся ў парабкі да Вас,
Гаспадыня зорнага палаца.
Клапаціцца, каб агонь ня згас, —
Незямная і зямная праца.

Ваш палац, ён з мрой маіх аб Вас,
І агонь — пасаг ад бліскавіцы,
Блаславіла Мілавіца час,
Каб палацу шчасьцем засяліцца.

Сподзеў любіць грэцца ля вагню,
Што з нябёс абнізіўся на долы,
Навальніца ўчуе цішыню,
Сам сябе суцішыць сум вясёлы.

Здольны той жыцьцём рызыкаваць,
Хто прыйшоў на сьвет, каб закахацца
Я прашуся ў парабкі да Вас,
Гаспадыня зорнага палаца.



## ЗОРКІ НАШЫЯ

Зоркі нашыя ў небе бяз нас
Пазнаёміліся выпадкова.
Мы якраз на зямлі ў гэты час
Прашапталі спрадвечнае слова.

Зоркі нашыя ў небе бяз нас
Шчырасьцю незямной пакляліся.
Мы якраз на зямлі ў гэты час
Зазірнулі ў прадонныя высі.

Зоркі нашыя ў небе бяз нас
Весьці нас па зямлі захацелі.
Мы якраз на зямлі ў гэты час
Думалі аб патайным вясельлі.

Зоркі нашыя, толькі б ня згас
Позірк ваш і ў начы, і ў блакіце!
І апошнюю сьцежку для нас
Велікодным сьвятлом асьвяціце.

## КАВЯРНЯ

Цыгарэтны туман ападае ў кавярні,
І канкрэтны раман круціць хітры ліхвяр,
Пані трошкі ў гадах, вочы быццам ліхтарні
Тут слугуе туга, тут настрой гаспадар.

Чаркі змову вядуць, захапляюцца плёткі.
Пані трошкі ў гадах і ліхвяр нестары,
І хмялее ліхвяр, і ня лічыць адсоткі,
І штурхаецца жарсьць у людскім гушчары.

Як на шалях маўчыць і пяшчота былая,
Здрада цёмных начэй і спагада завей,
І каменны камін сарамліва палае,
І ўцякае ўспамін ад абдымкаў далей.

Звыклі ўсе да ахвяр у нязвыклай ахвярні,
Чырванець перасталі сырыя муры,
Ашукацца прыйшлі ў непрабуднай кавярні
Пані трошкі ў гадах і ліхвяр нестары.



## КАРЧМА

А жыцьцё — карчма,
А ў карчме здаўна
Мёд-гарэлку п'юць,
Прадаюць душу.
Колькі ні даюць,
П'юць усё да дна,
Кожнаму ліюць
Па яго каўшу.

Па каму каму,
Каму два камы,
І ў карчмы таму
Пасынкі й сыны.
А каму куму,
Каму дзьве кумы,
Каму зорны шлях,
Каму перуны.

З рук у рукі йдзе
Чарыца наўскач,
Хітры мёд на дне,
Хмель у берагах.
І гудзе карчма,
Тут і сьмех і плач,
Цешыць страх сябе
Ў чорта на рагах.



KAMUNIKAT.org

## КНЯГІНЯ

Княгіня характва, я верны Ваш \алоп,
Капрызаў Вашых неадступны лёкай,
І колькі навальніц ні адгуло б,
Мне не наблізіцца да Вас, далёкай.

Я ведаю, што і ня ведаеце Вы,
Хто ў Вас адну нахабна закаханы,
Хто толькі думкаю аб Вас жывы
І на крыжы мілосьці ўкрыжаваны.

Вы долам, як нябёсамі, йдзяцё,
Каб у прыгнечанай душы сьвітала,
І радуецца, як дзіцё, жыцьцё,
Што на зямлю лагода завітала.

Зірне на Вас — зарок забудзе мніх,
Бяз Вас прыдворня уздыханцаў гіне.
Дык ведайце, што першы сярод іх
Я, Ваш халоп пакорнейшы, Княгіня.



## МНЕ Б ТОЛЬКІ...

Мне б толькі не забыцца Вас забыць,
Забыць і вочы Вашы, й рукі Вашы.
І перасьмягламу з глыбокай чашы
Ваду зачараваную ня піць.

Прашу падданства Вашага даўно,
А Вы, як сувярэнная дзяржава,
Мне адмаўляеце, але ласкава —
Мой сподзеў грэе гэтае адно.

Няўжо мой смутак Вас не закране,
Няўжо спагада на мяне не гляне?
Няйначай быць у космасе каханьня
Пылінкай дробнай давядзецца мне.

Я на зіму зьмяніў сваю вясну,
Жыву, пакуль мая журба жывая.
І я на Вас забыцца забываю
І помню Вас, няўмольную, адну.

## СПАДАРЫНЯ

Спадарыня, дазвольце пачакаць,
Пакуль на небе ўзыдуць зоркі ў ночы,
Дазвольце папрасіць і Вашы вочы
Да ціхай згоды сьцежку пашукаць.

Спадарыня, мне сумна аднаму,
Спадарыня, мне аднаму сьцюдзёна.
Пра Вас адну я думаю штодзённа,
Марнею і ня ведаю чаму.

Бяз Вас нямее жарсьць мая цяпер,
Як літары на стомленым граніце,
Мяне з увагі Вашай не ганіце,
За дзьверы не прасіце мой давер.

Спадарыня, дазвольце не маўчаць,
Спадарыня, дазвольце запытацца,
Ці можна ў Вас да раніцы застацца,
Каб разам дзень наступны прывітаць?



## ЧАКАЮ ВАС...

Чакаю Вас, абы паверыць цуду,
Чакаю Вас, пакуль адчай ня згас,
Чакае вязень так свайго прысуду,
Каб волю ўбачыць хоць апошні раз.

Чакаю Вас, абы сябе праверыць,
Ці доўга я бяз Вас магу пражыць.
Так веташок праз аблачынаў нерац
Трымценьнем нерастрачаным дрыжыць.

Чакаю Вас, абы даверыць сподзеў
Пад восеньскія позіркі журбы.
Так на сустрэчу праз імглу стагоддзяў
Ляцелі нашай згоды галубы.

Чакаю Вас, каб зьверыць нецярпеньне
З тым часам, што заручыць назаўжды.
Настрой пануры так чакае зьмены,
Чакае лёд халодны ўздых вады.

## ЧОВЕН

А мы з табой, як човен з хваляю,
Адзін другога даганяем,
То набліжаемся, то далеем,
Вітаемся за небакраем.

То хваля лашчыцца, то юшыцца,
А човен хвалю працінае.
То завірушна неба рушыцца,
То цешыць цішыня начная.

Надвор'е на душы няціхае,
Бо мы дасюль не разгадалі,
Ці хвалю човен ускалыхвае,
Ці човен стрымлівае хваля.

Ад суму сохне, рассыхаецца
На беразе самотны човен,
І хваля ў роспачы кідаецца
Ў вір галавой ад цёмных змовін.



## Я ВАС ЧАКАЎ...

Я Вас чакаў зь вясны да сівізны,
Як вечны вязень раніцу чакае.
І вы прыходзілі парою ў сны,
Далёкая, як зорка трапяткая.

Я Вас шукаў як не па ўсёй зямлі,
І ў кожнай маладой, неразгаданай
Вы, ўзьнёслая, былі і не былі,
Плылі ракой, разводзьдзем разгайданай.

Я Вас гукаў, і голас мой змаўкаў
Перед красой, нябачанай вякамі,
Ішоў за Вамі ценем — цень зьнікаў,
І словы захапленьня замаўкалі.

Я жыў чаканьнем і цяпер жыву
Надзеяй, што сустрэну хоць зімою,
Хілю засьнежаную галаву
І дзякую за веснавую мрою.

## Я ЎСЁ СВАЁ ЖЫЦЬЦЁ...

Я ўсё сваё жыцьцё да Вас ішоў,
Але здарожыўся на паўдарозе.
І зараз у маркоце і трывозе
Хацеў бы ў раньні шлях падацца зноў.

Ды гэты шлях дачасна зьвечарэў,
Ён іншых вёў, ён іншым быў кароткі.
Сьвяткуючы сваёй самоты ўгодкі,
Мой цень туляўся ля бязгнёздых дрэў.

А Вы не дачакаліся мяне,
Бо пра мяне ня ведалі нічога.
Што Вам мая маркота і трывога?
Бо пазнаёміўся я з Вамі ў сьне.

Мы не сустрэнемся — як astravy,
Спагады зорка не ўзышла над намі,
Ня фэбуйце хаця маімі снамі,
І ў сьне хаця
мне вернай будзьце Вы



## ЯК ВЕЧАР, СЬВЕЧКА...

Як вечар, сьвечка сьветла дагарае,
І мы чакаем, покуль дагарыць,
Апошняя хвіліна дарагая
Нам дазваляе ўсё дагаварыць.

Нам дазваляе нашае расстаньне
Расстацца сёньня, ды не назаўжды,
Смуга растане, смутак — не растане,
Чакаць нас будуць нашыя гады.

І жыць мы будзем гэтымі гадамі,
Што нас сустрэлі сьвятам на зямлі,
Ліст жоўты нам пра восень нагадае,
Зялёны — пра вясну, ў якой былі.

І вечар дагарыць, і ноч настане,
Ды ўжо не наша ноч упершыню.
Нясьмелае, як першае каханьне,
Сьвітаньне будзе слухаць цішыню.



KAMUNIKAT.org

## ЯК СГРАШНА МНЕ
## НЯ ЎБАЧЫЦЬ БОЛЕЙ ВОЧЫ...

Як страшна мне ня ўбачыць болей вочы,
Ў якіх плывуць хмурынкі даўніх дзён.
І сорам Ваш жаночы і дзявочы
Разгубленасьць маю бярэ ў палон.

Сябе, як той агонь патухлы, грэю,
Лаўлю з трывогай кожны сумны ўздых,
Ці ў водмаладзь іду, а ці старэю,
Што хочацца абдымкаў маладых?

Мне Вашага паўслова дастаткова
Каб я згубіў развагу і спакой.
І галава мая ў пятлю гатова,
Разьвязаную Вашаю рукой.

Свой лёс цяпер нялёгка перайначыць.
Я хоць надзею кволую тулю.
Дазвольце слухаць Вас, дазюльце бачыць,
Дазвольце не сьпяшацца у пятлю.



## ПРАШУ СПАГАДЫ Ў ВАШАЕ РУКІ...

Прашу спагады ў Вашае рукі —
Вясельле мы згуляем баравое,
Заручаць нас у небе жаўрукі,
І срэбны ложак нам засьцелюць хвоі.

Дагоніць рэха нашу цішыню,
І чуткі не абразяць нашу згоду,
І закалышуць хмары вышыню,
Самота ўспомніць даўнюю лагоду.

І цені пераблытаюць сябе,
Сны крозамі, а крозы стануць снамі,
Пачну наіўна верыць варажбе,
Забудуся на ўсё на сьвеце з Вамі.

Хачу напіцца з радаснай ракі,
Удачу запрасіць хутчэй у госьці.
Прашу пакорна Вашае рукі,
Каб не адбіўся я ад рук мілосьці.

## У ПОУНЫМ КЕЛІХУ ВІНЫ...

У поўным келіху віны
Крычэлі вочы захапленьня,
Мы ў ночы той былі адны
Начлежнікамі лятуценьня.

Чакаў у небе Валапас,
Калі ў душу самота гляне.
Лагоднасьці вучыла нас
Сьляпая логіка каханьня.

Было нам добра на зямлі,
Нібы за пазухай у Бога.
Мы ведалі, што мы былі
І верылі, што будзем доўга.

Гулі наіўнасьці чмялі,
Пяшчотай поўніліся соты,
Віно цьвярозае пілі
Задыялектыку маркоты.



## ЯК МАЛАДЗІК, Я СІРАЦЕЎ...

Як маладзік, я сірацеў,
Высока зорыліся Шалі,
Я Вашым ценем быць хацеў,
А Вы мяне не заўважалі.

Шлях да сьвітаньня карацеў,
Аблокі сьпёку жабравалі,
Я Вашым смуткам быць хацеў,
А Вы са сьмехам сябравалі.

Як адзінокі птах ляцеў,
Лічыў, як вёрсты, небасхілы,
Быць Вашым вестуном хацеў,
А Вы не блаславілі крылы.

Мой цень забрала засень дрэў,
Лісьцё надзеі ападае,
Як летні дзень, я пастарэў,
А Вы, як радасьць, маладая.



KAMUNIKAT.org

## Я ЁСЬЦЬ ТАМУ, ШТО ВЫ БЫЛІ СА МНОЙ...

Я ёсьць таму, што Вы былі са мной,
Што ў думках Вас я называў сваёю,
Я ціха сам дамовіўся з маной
Спрыяць майму шалёнаму настрою.

Ды я дапраўды зьнелюбеў мане,
Яна Вам змоўцу выдала з ахвотай,
Бяз Вас мяне няма, няма мяне,
Апаленага Вашаю пяшчотай.

Вы распалілі вогнішча ўва мне,
Яно гарыць, і я ў ім дагараю.
Няўжо ў траецкім ці ў грамнічным сьне
Стаялі Вы на ганку небакраю?

Смуга тугі ў душы не растае,
І новы ганак чуе крокі раньня,
Я дагару, пагаснуць дні мае,
Ды не пагасьне вогнішча каханьня.



## ЗОРКА БОСАЯ ЙШЛА ПА ЗЯМЛІ...

Зорка босая йшла па зямлі,
Я хацеў ёй купіць чаравічкі,
Толькі як згаварыцца, калі
У яе незямныя прывычкі.

Зорка босая йшла па расе,
І сьляды яе не астывалі,
І вятры слугавалі красе,
Халады ад яе адставалі.

Зорка босая йшла нацянькі,
Бо спазьніцца баялася дужа,
Дзе ступала, цьвілі васількі,
Дзе стаяла — ўсьміхалася ружа.

Зорка босая йшла ў тумане
Кладкай зыбкай над хітрай вадою,
Зорка босая йшла да мяне,
Каб аднойчы назвацца табою.

## Я ВЫДУМАЎ ЦЯБЕ, ЦІ ЁСЬЦЬ..

Я выдумаў цябе, ці ёсьць
Ты сапраўды на гэтым сьвеце,
Як ёсьць адчай, як ёсьць мілосьць,
Як ёсьць сьпякота ў кожным леце.

Калі ня выдумаў, тады
Чаму цябе няма са мною
Ля абначэлай чарады,
Пад аблачынай праліўною?

Ля абначэлай чарады
Маіх гадоў, што засталіся
Шукаць забытыя сьляды
На доле і ў нябеснай высі.

Пад аблачынай праліўной
Маёй гаркоты і маркоты,
Па той адной, па той адной,
Якую ведаеш даўно ты.

Табой назвалася яна —
Чыя мана, чыя віна...



## Я НЕ СЬПЯШАЮСЯ ЗІМУ СУСТРЭЦЬ...

Я не сьпяшаюся зіму сустрэць,
Пакуль гасьцюе лета ў сэрцах нашых.
Пакуль шалее хмель у поўных чашах,
Агню лагоды хочацца гарэць.

Я Вас праводжу, як праводзяць ноч,
Сьцямнелую ад жарсьці і зьнямогі,
Кілімы ўдзячнасьці сьцялю пад ногі,
Шлю рэха радасьці ісьці наўзбоч.

Як раніцу, я сустракаю Вас,
Ад суму адзічэлы і ўначэлы,
Крылатага стральца сьляпыя стрэлы
Цаляюць у ратунак мой якраз.

Баюся страціць Вас і пастарэць,
Мая вясна і лета залатое.
Мне варта жыць было б хаця б затое,
Каб Вас, неразгаданую, сустрэць.

## УСПОМНІЦЕ ХОЦЬ РАЗ ТАГО ЗАБЫТАГА...

Успомніце хоць раз таго забытага,
Што незабытна помніць толькі Вас,
Магчыма, і ня ведаеце Вы таго,
Што сьвет далёкай зоркі не пагас.

Успомніце хоць раз свайго няпершага,
Якому першай засталіся Вы.
У радасьць падарожжа не завершана,
Расстаньне ў неба ўзьнесьлі журавы.

Успомніце хоць раз таго наіўнага,
Што верыў Вам, што верыць і цяпер,
Успомніце хоць раз таго парыўнага,
Што парываўся ўкрасьці Ваш давер.

Успомніце хоць раз таго раўнівага,
Што раўнаваў Вас да сябе самой,
Успомніце хоць раз таго шчасьлівага,
Які навек заручаны з журбой.



## МНЕ НЕ ХАПАЕ ВАШАЙ ЦІШЫНІ…

Мне не хапае Вашай цішыні,
У якой чуваць, як вейка ападае,
Мне не хапае Вашай вышыні,
Зь якой зьнікае н.пічка маладая.

Як сьветла зьнічка кленчыла зямлі,
Мы на яе набожна загадалі,
Пакуль нябёсы нашымі былі,
Маўчаць мне Вашы вочы загадалі.

Мне ўпэўненасьці Вашай не стае,
Мне не хапае Вашага адчаю,
Я забываю на гады свае
І ва ўспамінаў сьмеласьць пазычаю.

Сваю нясьмеласьць некалі таіў
І мроіў некім, гэта значыць Вамі,
З крыніцы свойскай жаўрука паіў,
Каб ён зьвінеў над спраўджанымі снамі.

Мне не хапае Вас і толькі Вас,
Ручны жаўрук даўно жыве ў блакіце.
А Вы мяне ці ўспомнілі хоць раз?
Як не лістом, хоць рэхам адкажыце.

## ПРАШУ ЦЯБЕ ВЯЛЬМОЖНА, РАЗЬВІТАНЬНЕ...

Прашу цябе вяльможна, разьвітаньне,
Не падганяй, шляхі не караці.
Яшчэ не падрасло маё каханьне,
Яно яшчэ разгубіцца ў жыцьці.

Цябе баідца першае спатканьне,
Яно здалёку да мяне прыйшло,
Так зноў грахоў баіцца пакаяньне,
Баіцца цемры сьмелае сьвятло.

Малю цябе трывожна, разьвітаньне,
Туман начэй заўчасна не разьвей,
Яшчэ маё малее дакараньне
І не ахрып сьвітальны салавей.

Цябе баіцца першае маўчаньне,
Яно адно пра ўсё сказала мне,
Так рук свіх баіцца дакрананьне,
Баіцца дол, што хваля захлыне.

Крычу табе астрожна, разьвітаньне,
Як зваць маю самоту —. ня пытай.
Прыйдзі тады, калі мяне ня стане,
І смутак мой са сьветам разьвітай.



## ІШЛА НАД ЦІХІМ ЛЕСАМ ПОЎНЯ...

Ішла над ціхім лесам поўня,
Расы чакалі верасы,
Пад вербамі ў нагрэтым чоўне
Дзяўчына мыла валасы.

Яшчэ худзенькімі рукамі
Вязала мокрыя вузлом,
Усьмешка па вадзе блукала,
Хмурынкі возера вязло.

Прасілася ў косы стрыжка,
Шаптала з берагам карма,
А косак не хапала крышку,
Каб дзьве лілеі ўтрымаць.

Ледзь-ледзь хавалі зайздрасьць хвалі,
Аж закіпалі ў трысьці,
Мяне і човен падмывалі
Далёка зь юнай заплысьці.

## ВЫ МНЕ ЖЫЦЬЦЁМ І ЗАБЫЦЬЦЁМ БЫЛІ...

Вы мне жыцьцём і забыцьцём былі,
І першым, і апошнім спадзяваньнем.
За Вамі я ішоў на край зямлі,
На выспу сноў, што звалася каханьнем

За Вамі йшоў, і Вы мяне вялі
Па сьцежках роспачы і ўратаваньня,
І я ня ведаў, скончыцца калі
З жаданымі пакутамі блуканьне.

Я адставаў, я Вас дагнаць хацеў,
Нясьмелы ў ранішніх сваіх намерах,
Рака тугі цякла, і ўсё круцеў
З агеньчыкам мальбы чаканы бераг.

У шчырасьць нябыцьця рака ўцячэ,
Сябе саміх дагнаць не змогуць хвалі,
Ня ведаю — ці будзеце яшчэ,
Ды дзякуй, што былі і што кахалі.



## ВЫ ЗБЛЫТАЛІ МЯНЕ СА МНОЙ...

Вы зблыталі мяне са мной...
Абраны Вамі ў гэтай зале
Не столькі я, а болей той,
Каго Вы некалі кахалі.

Я Вашай нагадаў журбе,
Што хвалі човен ашукалі,
І нагадаў я сам сабе
Таго, каго Вы не кахалі.

Усё пад небам — варажба,
Усіх прымае сьвет варожа,
У кожнага свая журба,
Мы іх і пазнаёмім, можа.

Сьмяецца рэдка лёс-айчым,
З чужой бяды ён кпіць ахвочы,
А мы пяшчотна памаўчым —
Няхай гавораць нашы вочы.

## Я ДА ЦЯБЕ ХАЧУ ЛЯЦЕЦЬ ЯК СЬНЕГ...

Я да цябе хачу ляцець як сьнег,
Але скажы: што будзе, як растану?
Зьбянтэжыць можа твой сьпякотны сьмех
Маю непрашаптаную пашану.

Хачу імчаць на быстрым скакуне,
Але скажы: дзе табуны начуюць?
Я б вецер асядлаў, каб вёз мяне,
Ды табуны вятроў мяне не чуюць.

Хачу на чоўне да цябе плысьці,
Але скажы: калі ў ракі ймяніны?
Лёд на вадзе, а берагам брысьці —
Марудна прывыкаюць успаміны.

Я да цябе лячу, імчу, плыву
У апантаных мроях, снах бяссонных.
Крычу ў вякі, згубіўшы галаву,
І крык сузорыцца ў нябесных схонах.



## ВЯСНОВЫ ДЗЕНЬ

Вясновы дзень быў радасьцю даўгі,
Ды скарацеў, зрабіўшыся зімовым.
Цяпер даўжэе ноч маёй тугі,
Яна не падуладная замовам.

Я разумею ноч, а мне яна
Не паспрыяе, не паспагадае.
Тады было сьвятло, была вясна,
Цяпер азябла цемра галадае.

А ўсё таму, што Вас няма са мной.
А Вы былі калісьці ці ніколі?
Былі маёй зялёнаю вясной,
Вясёлаю бярэзінаю ў полі.

Як той бяздушны вецер, я п'янеў,
І быў зялёны я ў сваім наіве.
Быў добры першы гром і першы гнеў,
І першы сьлед на некранутай ніве.

Штоноч даўжэе ноч маёй тугі,
Радзей вясновае сьвітаньне сьніцца.
Зьвіняць майго адчаю ланцугі.
Самота — беспрасьветная цямніца.

## ЗОРКІ НАШЫЯ

Зоркі нашыя ў небе бяз нас
Пазнаёміліся выпадкова.
Мы якраз на зямлі ў гэты час
Прашапталі спрадвечнае слова.

Зоркі нашыя ў небе бяз нас
Шчырасьцю незямной пакляліся
Мы якраз на зямлі ў гэты час
Зазірнулі ў прадонныя высі.

Зоркі нашыя ў небе бяз нас
Весьці нас па зямлі захацелі.
Мы якраз на зямлі ў гэты час
Думалі аб патайным вясельлі.

Зоркі нашыя, толькі б ня згас
Позірк ваш і ў начы, і ў блакіце!
І апошнюю сьцежку для нас
Вялікодным сьвятлом асьвяціце.



## ЯК СТРАШНА МНЕ НЯ ЎБАЧЫЦЬ БОЛЕЙ ВОЧЫ...

Як страшна мне ня ўбачыць болей вочы,
Ў якіх плывуць хмурынкі даўніх дзён.
І сорам Ваш жаночы і дзявочы
Разгубленасьць маю бярэ ў палон.

Сябе, як той агонь патухлы, грэю,
Лаўлю з трывогай кожны сумны ўздых,
Ці ў водмаладзь іду, а ці старэю,
Што хочацца абдымкаў маладых?

Мне Вашага паўслова дастаткова
Каб я згубіў развагу і спакой.
І галава мая ў пятлю гатова,
Разьвязаную Вашаю рукой.

Свой лёс цяпер нялёгка перайначыць.
Я хоць надзею кволую тулю.
Дазвольце слухаць Вас, дазвольце бачыць,
Дазвольце не сьпяшацца у пятлю.

KAMUNIKAT.org

Літаратурна-мастацкае выданьне
Барадулін Рыгор Іванавіч

**Зорка спагады**
Рамансы

Выканаучы прадзюсер
Дзьмітрый Падбярэзскі

Афармленьне вокладкі
Вячаслава Паўлаўца

Мастацкі рэдактар
Ігар Левін

Тэхнічны рэдактар
Жана Лашкевіч

Карэктар
Галіна Більдзюкевіч

Здадзена ў набор 15.01.2000, падпісана ў друк
20.02.2000, фармат 60 х 84 $^{1}/_{32}$, гарнітура "Таймс",
ум.-друк.арк.1,05, ум.-выд арк.1,9, наклад 500 асобн.
Рэкламна-выдавецкая фірма «Ковчег», ліцэнзія ЛВ
№180
ад 23. 01.1998 г.,
220012, Мінск, вул.Кедышкі, 8-1а.
Надрукавана на капіравальна-размнажальным участку
выдаўца.

KAMUNIKAT.org